Тэрмін захоўвання ў аб'ектах паштовай сувязі паштовых адпраўленняў?

У адпаведнасці з пунктам 132 Правіл аказання паслуг паштовай сувязі агульнага карыстання, зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь
ад 7 верасня 2004 г. № 1111, тэрмін захоўвання паштовых адпраўленняў пры немагчымасці іх уручэння карыстальніку лічыцца з дня, які ідзе следам за днём паступлення паштовага адпраўлення ў аб'ект паштовай сувязі, і складае для:

- унутраных адпраўленняў паскоранай пошты – 10 каляндарных дзён;
- міжнародных адпраўленняў паскоранай пошты – 14 каляндарных дзён;
- заказных лістоў з адзнакай «Судовая павестка. З заказным паведамленнем» – 7 каляндарных дзён;
- астатніх паштовых адпраўленняў – 30 каляндарных дзён.

Раздел
Почтовая деятельность

Source URL:
https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/faq/termin-zahouvannya-u-abektah-pashtovay-suvyazi-pashtovyh-adpraulennyau